Поль Бауэр в своей работе «Три очерка о концепции доверия и ее основах» предложил свою формулу доверия. $A$ доверяет, т.е. оценивает надежность доверенного лица $B$ в отношении некоторого поведения $X$. Трех параметров $ABX$ достаточно, чтобы определить концепцию доверия. Со временем приведенная формула доверия уточнялась. К ней были добавлены контекст и момент времени. Именно эти дополнительные параметры формулы доверия позволят наиболее полно и точно описать политическое доверие.

Политическому доверию свойственно опираться на результаты, демонстрируемые политическими институтами в определенное время. Также можно отметить, что доверитель существующие результаты функционирования политических институтов преломляет через свой опыт взаимодействия с ними и/или уровни осведомленности, информированности.

Таким образом, формулу политического доверия считаю необходимым дополнить существенным элементом, а именно оценкой уровня осведомленности доверяющего. Именно определение уровня осведомленности позволит наиболее полно и точно отделять респондентов, которые руководствуются «политическими мифами», и тех, кто «условно-рационально» принимает решение об участии или неучастии в той или иной активности политических институтов. Именно такой подход в определении феномена политического доверия позволяет использовать методологию, описывающую определенный нарратив и прогнозировать последствия принятия политических решений.

***Д.І. Наумаў,*** *канд. сацыял. навук, дацент*
*БДЭУ (Мінск)*
***С.У. Шошын,*** *канд. юрыд. навук, дацент*
*cedrus2014@mail.ru*
*СНДДУ ім. Н.Г. Чарнышэўскага (Саратаў)*

http://edoc.bseu.by/

## СТРАТЭГІЯ ЭКАНАМІЧНЫХ ПАВОДЗІНАЎ ЯК НАВУКОВЫ КАНСТРУКТ

У сучаснай эканамічнай сацыялогіі праблематыка эканамічных паводзінаў індывіда з'яўляецца адной з цэнтральных даследчых тэм. Пры гэтым эканамічныя паводзіны разумеюцца ў якасці комплексу рацыянальна арыентаваных сацыяльных дзеянняў індывіда, звязаных з выкарыстаннем розных эканамічных рэсурсаў і накіраваных на атрыманне пэўнай выгады. Традыцыйна ў эканамічнай сацыялогіі праблематыка эканамічных паводзінаў індывіда разглядаецца ў кантэксце матывацыі і стымулявання працы работнікаў, выяўлення ролі чалавечага капіталу ў эканамічным развіцці грамадства, у вызначэнні і вывучэнні эканамічных патрэбаў і матываў, у характарыстыцы якасці і стылю жыцця.

Стратэгія эканамічных паводзінаў характарызуе эфектыўнасць эканамічных паводзінаў індывіда і спосаб сацыяльнага быцця, заснаванага на індывідуальнай сістэме каштоўнасцяў і мэтаў, рэалізацыя якога спрыяе эфектыўнасці чалавечага жыцця [1]. Дадзены канструкт на ўзроўні арганізацыі характарызуе яе стратэгічныя прыярытэты, на ўзроўні соцыума — эканамічную і сацыяльную палітыку дзяржавы, на індывідуальным узроўні — жыццёвыя планы, мэты, спосабы і сродкі іх дасягнення.

У.М. Валодзін і С.Г. Міхнево прапануюць наступную класіфікацыю эканамічных стратэгій асобы [2]:

- па крытэрі адносін да працы — працоўныя (арыентаваны на сістэматычны ўдзел у працоўнай дзейнасці, прафесіяналізм і майстэрства), утрыманскія (адмаўляюцці ад працы і фарміруюць устаноўку на пастаянную знешнюю дапамогу і падтрымку), дэвіянтныя (арыентаваны на незаконныя спосабы атрымання высокага даходу);

- па крытэрыі якасці — актыўныя (максімізацыя працоўных намаганняў, інтэнсіфікацыя працоўнай і прафесійнай дзейнасці, устаноўка на складанасць працы і высокі даход), актыўна-пасіўныя (мінімізацыя працоўных намаганняў, невысокія патрабаванні да параметраў працоўнай і прафесійнай дзейнасці, устаноўка на ільготы і невысокі, але пастаянны даход).

У цэлым увага да канструявання і рэалізацыі стратэгій эканамічных паводзінаў індывідаў абумоўлена наступнымі асноўнымі момантамі. Па-першае, стратэгію эканамічных паводзінаў гіпатэтычна можна разглядаць у якасці аксіялагічнай дэтэрмінанты статусу чалавека на рынку працы, які ў сістэме сацыяльных каардынат выступае як базавы сацыяльны і эканамічны параметр. У дадзеным выпадку ўсе астатнія сацыяльныя характарыстыкі індывіда (матэрыяльнае становішча, даходы, характар спажывання, стыль жыцця, сацыяльны статус і інш.) у адносінах да яго статусу на рынку працы з'яўляюцца другаснымі. Па-другое, для асобнага работніка паўнавартасная рэалізацыя яго індывідуальнасці ў вытворчым працэсе і працоўных адносінах вызначае як якасць жыцця, так і пазітыўны сацыяльна-эканамічны вынік. Пры гэтым дадзены вынік у маштабах сучаснага грамадства мае мультыплікацыйны эфект. У маштабах жа сучаснай эканамічнай сістэмы, заснаванай на інавацыях, канкурэнцыі і адкрытасці (эканоміка ведаў, глабальная эканоміка і інш.), не толькі веды, здольнасці і кампетэнцыі індывіда, але і яго каштоўнасныя арыентацыі і мэтавыя ўстаноўкі выступаюць у якасці эканамічнага рэсурсу.

**Крыніцы**


1. *Максименко, А.А.* Стратегии экономического поведения российской молодежи / А.А. Максименко. — Кострома : Изд-во ГОУ ВПО КГУ им. Н. А. Некрасова, 2006. — 224 с.
2. *Володин, В.М.* Экономическое поведение молодежи в условиях модернизации российского общества / В.М. Володин, С.Г. Михнева // Изв. высш. учеб. заведений. Поволж. регион. Общественные науки. — 2012. — № 3(23). — С. 121–126.



***Д.І. Наумаў,*** *канд. сацыял. навук, дацэнт*
*БДЭУ (Мінск)*
***І.А. Яблычнікава,*** *канд. пед. навук, дацэнт*
*cedrus2014@mail.ru*
*Акадэмія ФСВП Расіі (Разань)*


http://edoc.bseu.by/

# АСОБАСНЫ РЭСУРС ЯК ФАКТАР ЭКАНАМІЧНЫХ ПАВОДЗІНАЎ МОЛАДЗІ

У сучасным грамадстве эканамічныя паводзіны моладзі абумоўліваюць розныя фактары, сярод якіх асаблівую ўвагу трэба надаць асобаснаму рэсурсу. У сацыялогіі катэгорыя «асобасны рэсурс» вызначаецца як набор розных структурна-функцыянальных характарыстык індывіда, якія забяспечваюць агульныя віды жыццядзейнасці і спецыфічныя формы індывідуальнай адаптацыі да сацыяльных умоваў. Акрамя таго, у сацыяльна-псіхалагічным аспекце склад асобаснага рэсурсу характарызуюць індывідуальныя псіхалагічныя якасці (воля, тэмперамент, эмацыйныя і камунікатыўныя характарыстыкі індывіда), якія выконваюць значную ролю ў фарміраванні псіхалагічнай устойлівасці індывіда да стрэсаў і стрэсагенных фактараў.

У дачыненні да моладзі, з пункту гледжання К.У. Абрамава, у якасці яго асноўных кампанентаў выступаюць наступныя сацыяльна-псіхалагічныя рэсурсныя магчымасці [1]. Па-першае, гэта асабістая і сацыяльная актыўнасць моладзі, якая выяўляецца ў высокім